# ПРАДМОВА

*Хада гісторыі мяняе не толькі граніцы дзяржаў, але і месца знаходжання іх сталіц. На беларускіх землях першапачаткова дзяржаўна-культурнымі цэнтрамі з'яўляліся Полацк і Тураў. Потым, з утварэннем Вялікага Княства Літоўскага, з уступленнем на трон Міндоўга, збіральнікам беларускіх і літоўскіх зямель стаў Навагарадок — Навагрудак. Затым улада засяродзілася ў Вільні. Але ўжо з канца XVI ст. з'явілася ёй альтэрнатыва — не старажытныя Полацк, Тураў ці Гродна, не ваяводскія Мінск, Віцебск, Магілёў ці Мсціслаў, хоць іх палітычная і гаспадарчая вага і ўзрастала, а сціплы раней, драўляны да Радзівіла Сіроткі, Нясвіж, цэнтр аднаго з княстваў, потым — ардынацыі.*

*Метафарычна можна сказаць, што з канца XVI да канца XVIII ст. Нясвіж з'яўляўся некаранаванай сталіцай беларускіх зямель. Тут, у рэзідэнцыі Радзівілаў, у многім вызначалася палітыка Вялікага Княства Літоўскага, а нават (асабліва ў XVIII ст.) і ўсёй Рэчы Паспалітай. Тут засяроджваліся гаспадарчае жыццё, велізарныя багацці, магутныя вайсковыя сілы, часам большыя, чым у самога караля. Тут канцэнтравалася культурнае жыццё: у 1562 г. была Сымонам Будным выдадзена першая беларуская кніга на тэрыторыі сучаснай Беларусі, у канцы XVI ст. — узведзены другі ў Еўропе храм у стылі барока, а ў сярэдзіне XVIII ст. распачаў дзейнасць першы прыдворны (прыгонны) тэатр на беларускіх землях. Адпаведна ў Нясвіжы памнажаліся і культурныя каштоўнасці — архіўныя, бібліятэчныя, музейныя (асабліва творы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва). Потым, з другой паловы XVIII ст., яны пачынаюць расцякацца па бліжэйшых і далёкіх краінах, вывозіцца ў Пецярбург і Варшаву, Маскву і Вільню, Берлін і Хельсінкі, класціся там у аснову славутых збораў.*

*І, тым не меней, у XIX ст. у Нясвіжы заставалася многа матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Яны памнажаліся і ў XX ст., да 1939 г. Але падзеі Другой сусветнай вайны прывялі да поўнага культурнага спусташэння радзівілаўскіх калекцый. І цяпер, плануючы аднаўленне Нясвіжа як нацыянальнага музея-запаведніка, мы павінны пачынаць збіранне яго гістарычных каштоўнасцей практычна з нуля, выяўляць, што і дзе захавалася ў суседзяў, каб яго сумесна выкарыстоўваць або і вяртаць, калі на тое ёсць юрыдычнае права ці добрая воля кіраўнікоў.*

*Камісія «Вяртанне» пры Беларускім фондзе культуры, часовыя навуковыя калектывы, якія ўтвараліся ў Цэнтры імя Ф. Скарыны дзякуючы дапамозе ЮНЕСКО і Дзяржаўнага камітэта па навуцы Рэспублікі Беларусь, заўсёды трымалі ў полі зроку лёс нясвіжскіх збораў. Пра іх ідзе гаворка ў 1–4 і 6 зборніках «Вяртанне». Многа ўвагі прысвячалі ім дакладчыкі на Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей», праведзенай у Мінску пад эгідай ЮНЕСКО ў 1997 г.*

*І вось на суд чытачоў аддаецца чарговы, сёмы зборнік «Вяртанне», на гэты раз цалкам прысвечаны зборам Радзівілаў. У яго ўключаны як агульныя артыкулы аб прынцыпах стварэння навукова-даследчага апарата і асноўным змесце віртуальнага архіва князёў Радзівілаў (Ала Галубовіч, Аляксандр Міхальчанка), так і канкрэтнае апісанне дакументаў па гісторыі Беларусі ў Радзівілаўскім фондзе Дзяржаўнага архіва Літвы. Асаблівую цікавасць чытачоў выклічуць тры публікацыі праф. Надзеі Высоцкай (адна зроблена ў сааўтарстве з А. Міхальчанкам) пра нясвіжскую калекцыю радзівілаўскіх партрэтаў. Тут шырока выкарыстаны беларускія, польскія і ўкраінскія матэрыялы, многія з якіх (асабліва дакументы 1939–1941 гг.) упершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак.*

*На жаль, паказальнікі кнігі датычацца (па розных прычынах) толькі другой яе часткі.*

*Рэдкалегія зборніка спадзяецца, што яго матэрыялы будуць карысныя для вялікай справы зберажэння, памнажэння і вяртання нашай матэрыяльнай і духоўнай спадчыны.*

Адам Мальдзіс

KAMUNIKAT.ORG